ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 8 (28) Сакавік 2016**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно” Мінскай вобласці*







*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая 15 сакавіка 1994 года (змяненні і папраўкі ўносіліся ў 1996 і 2004 гг.), з'яўляецца дакументам вышэйшай юрыдычнай сілы, вызначае статус асобы, у ёй адлюстраваны прававыя прынцыпы, замацаваныя ў найважнейшых міжнародных дакументах. Яна ўстанавіла адказнасць дзяржавы за стварэнне ўмоў для годнага і свабоднага развіцця асобы.*

*Канстытуцыя гарантуе права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека ў адпаведнасці з яго прызначэннем і здольнасцямі, права на ахову здароўя, а таксама бясплатную агульную сярэднюю і прафесійна-тэхнічную адукацыю. Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступна для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі. Грамадзянам Беларусі гарантуецца права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку інваліднасці і па іншых прычынах. Дзяржава праяўляе клопат аб ветэранах вайны і працы, а таксама аб асобах, якія страцілі здароўе пры абароне дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Захаванне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паважлівае стаўленне да сімвалаў краіны – Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага гімна – патрыятычны абавязак кожнага з нас.*






Знакамітыя выпускнікі

# Сям'я – найважнейшая ячэйка грамадства

**СЯРГЕЙ ДАНІЛАВІЧ ЛАПЦЁНАК**
**(01.05.1935–03.04.2012)**



***Беларускі сацыяльны філосаф, сацыёлаг, спецыяліст па этыцы і тэорыі выхавання; доктар філасофскіх навук (1984), прафесар.***

Нарадзіўся ў вёсцы Васільеўка Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1958); аспірантуру БДУ па кафедры гісторыі філасофіі (1963).

*У 1958-1960* - кіраўнік лектарскай групы Мінскага абкама камсамола;

*1963-1967* - выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі філасофіі БДУ;

*1967-1972* - старшы навуковы супрацоўнік праблемнай НДЛ (навукова-даследчая лабараторыя) сацыялагічных даследаванняў БДУ;

*1972-1974* - дацэнт, загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі;

*1975-1977* - дацэнт кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму БДУ;

*1978-1985* - дацэнт, прафесар ІПК пры БДУ;

*1986-1988* - загадчык сацыялагічнай НДЛ праблем сацыялізацыі асобы БДУ.

Лапцёнак С.Д. працаваў у галіне тэорыі этыкі і праблем маральнага выхавання, даследаваў сацыяльна-этычныя праблемы сямейна-шлюбных адносін, каштоўнасныя арыентацыі і рэальныя паводзіны моладзі.

*С. Д. Лапценак – аўтар больш за 200 навуковых прац*, у тым ліку больш за 10 індывідуальных манаграфій і навучальных дапаможнікаў. Яго работы былі неаднаразова ўдастоены дыпломаў на розных конкурсах навуковых прац і твораў навукова-папулярнай літаратуры. Шырокую вядомасць і прызнанне атрымалі *кнігі «Этыка і этыкет», «Духоўна-маральны свет навучэнцкай моладзі»*.

Сяргей Данілавіч адыграў значную ролю ў інстытуцыялізацыі сацыяльна-этычных даследаванняў у Беларусі, а таксама актыўна садзейнічаў станаўленню Мінскага філасофскага праекта "Гуманітарная энцыклапедыя".

*(Заканчэнне на 3 старонцы)*

*(Заканчэнне. Пачатак на 2 старонцы)*




У сваіх працах абгрунтоўваў палажэнне, што этыка - філасофская навука, якая вывучае анталогію, гнасеалогію і праксіалогію маралі, гістарычныя сістэмы абгрунтавання маральнасці, спецыфіку фарміравання маральнай культуры грамадства і асобы ў канкрэтна-гістарычных умовах.

Метаэтыка, нарматыўная і прыкладная этыка, з яго пункту гледжання, фарміраваліся ў рамках філасофскіх ведаў. Сям'я разглядалася аўтарам як найважнейшая ячэйка грамадства, прыроднае і сацыякультурнае асяроддзе фарміравання асобы, як адносна самастойная сістэма існавання людзей. Найважнейшымі яе функцыямі з'яўляюцца гаспадарча-бытавая, выхаваўчая і арганізацыя вольнага часу. Сярод розных тыпаў сем'яў пераважае нуклеарная. Духоўна-маральныя патрэбы, інтарэсы і мэты з'яўляюцца вызначальнымі ў сямейна-шлюбных адносінах.




Сяргея Данілавіча не стала 3 красавіка 2012 года. Ён быў выдатным чалавекам, добрым, спагадлівым, прыстойным, вялікім працаўніком. Лектар ад Бога, Сяргей Данілавіч хутка знайшоў сябе ў жыцці, стаўшы даследчыкам праблем сям'і, вядучым у Беларусі спецыялістам па этыцы, выдатным настаўнікам і выхавальнікам моладзі. Заўседы ўсмешлівы, дэмакратычны і строгі адначасова, ён проста заварожваў студэнцкую аўдыторыю.

Вечна малады душой, вельмі тонка адчуваў людзей, умеў ствараць творчую атмасферу, высока цаніў прафесійна выкананую працу. Ён проста выпраменьваў высакароднасць і чалавекалюбства, карыстаўся шчырай павагай і аўтарытэтам сярод калег-навукоўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў.

Выхадзец з вялікай сялянскай сям'і, Сяргей Данілавіч пражыў складанае і ў той жа час шчаслівае жыццё. Нічога яму не падала з неба, за ўсё прыйшлося плаціць спаўна: дзяцінства, апаленае вайной, лясная школа ў партызанскім атрадзе, галодныя пасляваенныя гады, ранняе сіроцтва... Ганарыўся сваім родам, сям'ёй, што адбыўся як вучоны ў БДУ, быў адным з заснавальнікаў легендарнай Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў БДУ, якая стваралася пад кіраўніцтвам прафесара І. Н. Лушчыцкага, сваімі працамі па сацыялогіі сям'і і сваімі вучнямі. Сяргей Данілавіч першым з Беларусі абараніў доктарскую дысертацыю па этыцы ў Маскве.

Сяргей Данілавіч паспяхова спрабаваў сябе як самадзейны акцёр, пісьменнік, паэт, журналіст.

Рана стварыўшы сям'ю, ен стаў добрым мужам, клапатлівым бацькам і дзедам.

Пакінуў цікавую кнігу ўспамінаў «Так, мы – такія... Вытокі маральнасці. Гістарычная хроніка».

***Памяць пра Сяргея Данілавіча Лапцёнка – вучонага і чалавека – назаўжды застанецца ў сэрцах тых, каму пашчасціла ведаць яго і працаваць побач з ім.***

# Выбар прафесіі – гэта сур'ёзна!!!

## Выбар прафесіі вызначае — ці будзеце вы любіць панядзелак.

Прафесійная арыентацыя (лац. professio - род заняткаў і фр. orientation - устаноўка) - сістэма мер, накіраваных на аказанне дапамогі моладзі ў выбары прафесіі.

Для эфектыўнага выбару прафесіі моладзі важна дапамагчы сфарміраваць звычку выбіраць і прымаць адказнасць за ўсе наступствы свайго выбару, незалежна ад таго ўдалося іх прадбачыць загадзя, ці не.

***Прафесійная арыентацыя ўключае ў сябе:***

***Прафесійную асвету*** — забеспячэнне моладзі інфармацыяй аб свеце прафесій, навучальных установах, магчымасці прафесійнай кар'еры.

***Прафесійнае выхаванне*** — фарміраванне ў моладзі працавітасці, працаздольнасці, прафесійнай адказнасці, здольнасцей і схільнасцей.

***Прафесійнае кансультаванне*** па пытаннях выбару прафесіі, працаўладкавання, магчымасцяў атрымання прафесійнай падрыхтоўкі.

***Прафесійнае развіццё асобы*** і падтрымку прафесійнай кар'еры, уключаючы змену прафесіі і прафесійную перападрыхтоўку.



Адкрыты ўрок хіміі



Дзень самакіравання




Мерапрыемства "Усе прафесіі важны!"



Наведванне лясной гаспадаркі

# Дзень самакіравання

*“Школа, якую мы робім самі…”*

30 сакавіка 2016 года ў ДУА "Сярэдняя школа №2 г.Беразіно" прайшоў Дзень Самакіравання. Для вучняў гэта добрая магчымасць прымерыць прафесію настаўніка на сябе, праверыць арганізацыйныя здольнасці. Дзень самакіравання - адзін з дзейсных відаў прафарыентацыі. Гэтае мерапрыемства дае магчымасць вучням школы ў поўнай меры адчуць, наколькі няпростая праца ў выкладчыкаў. Настаўнікі-дублёры сур'ёзна і адказна паставіліся да сваіх абавязкаў, пад кіраўніцтвам педагогаў задоўга да ўрокаў пісалі



разгорнутыя планы-канспекты сваіх урокаў, рыхтавалі прэзентацыі да ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў. Старшакласнікам, якія паспрабавалі сябе ў ролі кіраўніцтва школы, давялося сутыкнуцца з рэальнымі праблемамі ў арганізацыі адукацыйнага працэсу і гаспадарчай дзейнасці ва ўстанове адукацыі, але з усімі праблемамі справіліся годна. У рамках дня



самакіравання вучні падрыхтавалі "Шоу талентаў" (9-11 клас), пазнавальную конкурсна-гульнявую праграму (5-8 клас). Цікавымі для вучняў школы першай і другой ступені былі мерапрыемствы на класных гадзінах. Дзень прайшоў пазнавальна, цікава, захаплялбна. Ва ўсіх засталося шмат пазітыўных эмоцый.

*Лізавета Вайцяховіч*









# Сем крокаў да правільнага рашэння ў выбары прафесіі





**1. Скласці спіс падыходзячых прафесій.**

Складзіце спіс прафесій, якія Вам падабаюцца, цікавыя, па якіх Вы хацелі б працаваць, якія Вам падыходзяць.

**2. Скласці пералік патрабаванняў да прафесіі, якую выбіраеш:**

- ✓ Прафесія і будучы род заняткаў;
- ✓ Прафесія і жыццёвыя мэты, каштоўнасці;
- ✓ Прафесія і мае сённяшнія “гарачыя” праблемы;
- ✓ Прафесія і рэальнае працаўладкаванне па спецыяльнасці;
- ✓ Прафесія і мае схільнасці, здольнасці;
- ✓ Пажаданы змест, характар і ўмовы работы.

**3. Вызначыць значнасць кожнага патрабавання.**

**4.Ацаніць сваю адпаведнасць патрабаванням кожнай з падыходзячых прафесій**



Акрамя тых патрабаванняў, якія ёсць у Вас да прафесіі, існуюць і патрабаванні самой прафесіі. Прааналізуйце, ці развітыя ў Вас прафесійныя якасці, ці адпавядаюць Вашы інтэлектуальныя здольнасці, псіхалагічныя асаблівасці, стан здароўя патрабаванням прафесіі.

**5. Падлічыць і прааналізаць вынікі.**

Прааналізуйце, якая прафесія больш за іншых падыходзіць Вам.

**6. Праверыць вынікі**.

Каб упэўніцца ў правільнасці Вашых разважанняў, абмяркуйце сваё рашэнне з сябрамі, бацькамі, настаўнікамі, псіхолагам.

**7. Вызначыць асноўныя практычныя крокі да поспеху.**



Вы прынялі рашэнне. Зараз важна вызначыць, у якой вучэбнай установе Вы зможаце атрымаць прафесійную адукацыю, як развіць у сабе прафесійна важныя якасці, як можна атрымаць практычны вопыт работы па спецыяльнасці.



Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 28, сакавік 2016 г.



# Фотарэпартаж

## Навукова-практычная канферэнцыя “Навука. Прырода. Чалавек”



























Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 28, сакавік 2016 г.

# Выпускнікам

## Афіцыйныя сайты аб прафесіях , шляхах працаўладкавання і выбару адукацыйнай траекторыі

- Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь **edu.gov.by**
- Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь **mintrud.gov.by/ru**
- Нацыянальны інстытут адукацыі **adu.by**
- Акадэмія паслядыпломнай адукацыі **academy.edu.by**
- Галоўны інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь **giac.unibel.by**
- Рэспубліканскі цэнтр прафесійнай арыентацыі моладзі **rcpom.edu.by**
- Інфармацыя аб вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь уключае звесткі аб спецыяльнасцях, правілах прыёму, выніках конкурсу і знаходзіцца на сайце: **abiturient.by**
- Інфармацыя аб установах адукацыі, спецыяльнасцях, спецыялізацыях, кваліфікацыях, формах, тэрмінах і кошту навучання, ўступных іспытах, адрасах, тэлефонах ССНУ **tamby.info**

## Жадаем усім вясенняга настрою…



ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Галуза Яўгенія, Цэнкель Алена, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына